З кафедры Ветсанэкспертызы.—Заг. дац. Горагляд Х. С.

# МЯСНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БССР

*Х. С. Горагляд*

Развіцце разніцкай справы ў некаторых гарадах Совецкай Беларусі мае сваі корні з адначасовым развіццем гарадоў у XVI, XVII і XVIII стагодзі.

Яшчэ у 1534 годзе[1]) Лянтвойта г. Полацку Багдан Панкоў разглядаў справы цэхаў мяснікоў, ад каторых мяшчане гораду патрабавалі подаць у гарадскую казну. Лянтвойта прысудзіў— прадставіць гэту справу на уласнае абмяркаванне мяснікоў.

У 1621 годзе[2]) магілеўскія мяснікі з мэтай упарадкавання свайго цэхавага статуту, карыстаючыся Магдебургскім правам і дазволам старастата замка Магілева, вынеслі пастанову аб недапушчанні другіх асоб гораду забіваць жывелу на мяса і гандляваць мясам. У тым жа статуту была адзначана:

„...хто з просолов наших Могилевских быдла до Могилева пригонит на продаж, теды мает таковый, пригнавшы быдло, Старосте и брати нашай аповедать и грош Литовский дать...“ и дальше:

„...Гость откуль колвек мяса солоное до Могилева прывез на продаж, теды тутейшые просолове перекуповаты у того, хто прывез, не маюць, але тые гости сами продавать мают поеднавши уряд Замковый и уряд наш мескій Могилевскій и на братню нашу, водлуг уваженя штож колвек даты мают...“

Такім чынам, мы бачым, што, згодна гэтага дакумента, цэхі мяснікоў мелі быццам-бы манаполію на забой жывелы на мяса і гандаль ім; апрача таго, яны атрымоўвалі падатак ад асоб „гостей“, якія, часам, прывазілі мяса ў Магілеў для гандлю.

У 1670 годзе[3]) Міхайлам IV была дана перавага Брэстскаму цэху мяснікоў на права забою жывелы і гандлю мясам. Гэтай жа граматай было вызначана: парадак уступлення ў члены цэха, выхаванне падмайстроў і абавязкі членаў цэха перад расійска-каталіцкімі касцеламі і ўніатскай царквой. У той-жа час мяснікам--яўрэям было прапанована плаціць падатак у казну цэхаў мяснікоў. Віцебск ў пачатку XVIII стагодзя карыстаўся граматай Аўгуста II[4]), у якой было вызначына месца гандлю мяснымі і рыбнымі прадуктамі. У гэтай жа грамаце гаворыцца,

што гандляры мясам павінны выконваць усе правілы і вымагі гораду, штогодна плаціць у казну цэха мяснікоў, але ні слова не сказана аб санітарным становішчы месц забою жывелы на мяса і гандлю мясам.

Паводле закона Iana Kazimirowisca (1664) Аугуст II у 1720 г. даў прывілегіі цэху магілеўскіх мяснікоў, прадаставіўшы ім права забіваць жывелу кожнай абшчыне каля касцелаў, сінагог і інш.

Такім чынам, мы бачым, што тыя часы на Беларусі справа забою жывелы на мяса знаходзілася ў руках прывілігіраваных гаражан—членаў цэху мяснікоў, каторыя карысталіся неабмежаванымі правамі. Месцы забою, а таксама і месцы гандлю мясам перапляталіся з рэлігійнымі укладамі і праводзілася ўсе гэта на плошчах каля касцелаў, царквей і сінагог.

У Менску да 1890 г. было 5 разніц, Гомелі да 1895 года—3 разніцы, Віцебску да 1898 г.—4 разніцы, Оршы да 1890 г.—2 разніцы, Полацку —2 разніцы

Па звесткам Веткіраўніцтва НКЗ БССР (1926 г.), і асабовым даследваннем намі гэтай справы (1929 г.) удалось выявіць, што ужо ў XIX стагодзі ў некаторых мястэчках былі пабудаваны разніцы, напрыклад: у Цімкавічах — 1875 г. Калінкавічах—1879 годзе, Горках — 1891 годзе, Копысі—1890 годзе. Частка разніц, з пачатку, будавалася яўрэйскім насельніцтвам — абшчынай, якая вымагала ад сваіх духоўнікаў—шэхетаў агляда мяса па рытуалу і значная частка будавалася мясагандлярамі. У канцы восьмідзясятых гадоў мясагандляры, улічыўшы даходнасць нават дробных разніц, насаджалі гэтыя разніцы, дзе было магчымым.

У дзевяностых гадах у буйных гарадах (Менску, Віцебску, Гомелі і др.) дробныя разніцы ўжо незадавальнялі патрабаванню насельніцтва як у забеспячэнні мясам, так і ў санітарных адносінах гарадоў. Таму на змену іх б. гарадскія ўправы пачалі будаваць новыя, буйныя разніцы, напрыклад у Менску дрэўляная разніца (1890 г), Віцебску (1898 г.), Гомелі (1895 г.), Орше (1890г) і др. Будаўніцтва разніц у вышэй паказаныя гады і пазней, а таксама і эксплаатацыя іх здавалася паасобным мяса гандлярам, якія зусім не клапаціліся аб добрай якасці выпускаемага мяса і санітарным становішчы разніц. Большасць такіх разніц будавалася на берагох рэк, напрыклад, у Віцебску, Менску, Гомелі, або на берагох рвоў—у г. Оршы, ці зусім на балоцістай мясцовасці—у Полацку, Менску, Жлобіне і др. Такім чынам разніцы будаваліся ў мінулым з такім разлікам, каб усе нечыстоты сплывалі ў раку, у роў, ці заставалася каля разніцы на нескарыстоўваемай зямле. Яны забруджвалі ваду ў раках, акаляючую глебу і з'яўляліся анцісанітарнай установай для гарадоў, мясцечак і др. насяленых мясцовасцяў.

Такія мяркаванні ў пачатку будаўніцтва разніц і эксплаатацыі іх (XVIII і XIX стаг.) амаль цалкам адпавядаюць развіццю

разніцкай справы ў XVI—XVII стагоддзі ў Заходняй Еўропе.[6])

З 1900 гадоў, у сувязі з ростам гарадского насельніцтва і павялічэннем запатрабаванняў да здаровай мясной ежы, былі пабудаваны новыя разніцы, напрыклад: у Менску (1900 г.), Мозыры і Бабруйску (1905 г.), Магілеве (1913 г.) і інш. Пры чым Магілеўская разніца, у той час, па тыпу і архітэктуры лічылася ўзорам разніцкага будаўніцтва.

У перыяд з 1900 па 1918 г. адчынен рад дробных прымітыўных разніц у Рагачове і Сянно (1900 г.), Клімавічах (1902 г.) Койданава (1908 г.) і др. На гэтых разніцах забіваўся на мяса скот, у значнай колькасці, для вывазу ў буйныя гарады. Прыватныя разніцы, у тыя гады, у большасці былі безнаглядныткі, ветэрынарныя ўрачы, сядзеўшыя ў павятовых гарадах, не сачылі за санітарным становішчам іх і не ведалі аб існаванні гэтых разніц.

Царскі ўрад, даўшы дазвол на адчыненне новых гарадскіх— грамадскіх разніц, аднačасова дазваляў адчыненне і прыватных, у выніку чаго ўтваралася канкурэнцыя паміж грамадскімі і прыватнымі разніцамі. Прыватныя ўладары за забой жывелы на іх разніцах брАлі меншую плату, чым на гарадскіх—грамадскіх, і заўседы былі ў барышах таму, што імі амаль ніякіх грашовых затрат не рабілася, як па ўдасканаленню абсталявання разніц, так і на санітарна-гігіенічнае утрыманне іх. Мяса, выходзячае з прыватных разніц, не праходзіла ветсаннагляд і часта выпускалася ў продажу хворым па дзешавейшай цане, чым мяса атрыманае на гарадскіх разніцах; гэта акалічнасць мела значны поспех у справе збыту мяса гандлярам-мяснікам. Разам з тым пашыраўся і тайны забой жывелы, з якім змагацца было занадта цяжка. Такім чынам, прыватныя разніцы і тайны забой жывелы выпускалі хворае мяса, з аднаго боку, а з другога—забруджвалі насяленню мясцовасць разнічнымі адыходамі і спрыялі распаўсюджванню інфекцыйных і інвазійных хвароб, як сярод людзей, так і сярод с/г жывелы.

На разніцах буйных гарадоў: Менску, Гомеля, Віцебску, Магілёва і др. к 1914 г. ужо мелісь сталыя ветработнікі, але пакольку амаль усе разніцы, нават і буйных гарадоў, да 1918 г. знаходзіліся ў руках прыватных асоб, усе мерапрыемствы санітарна-ветарынарнага характару, як ачыстка забруджаных вод, упарадкаванне скотапрыгоных двароў, пабудова санітарных разніц, арганізацыя лабараторый, уцільустановак і інш. не ажыццяўляліся, не гледзячы на дамаганні з боку грамадскай гарадской ветэрынары.

Да імперыялістычнай вайны (1914 г.) работа разніц па загатоўцы мяса выразілась у наступным (гл. табл. № 1).

Лічбы вышэй прыведзенай табліцы сведчаць аб тым, што ў апошнія гады перад вайной лік прадукцыі свінагадоўлі значна павышаўся, а прадукцыя мяса буйнай рагатай жывёлы паменшылась. Па справаздачным матар'ялам Вет. Упр. М. Ун. Спраў[7])

Табліца № 1

| Назва жывёлы і мяса | Колькасць галоў і тон мяса | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1909 г. | 1910 г. | 1911 г. | 1912 г. | 1913 г. | 1914 г. |
| Б. раг. жыв. - галоў . . . . . . . . | 289029 | 5065 | 2603 | 3461 | 5130 | — |
| Свіней . . . . . . . . . . . . . . | 27608 | 42518 | 46380 | 65044 | 41701 | 6100 |
| Авечак . . . . . . . . . . . . . | 34867 | — | — | — | — | — |
| Мяса розн. тон . . . . . . . . . . | — | — | — | 112,67 | 118,25 | 77,38 |

б. Віцебская губернія у 1909 г. па забою буйнай раг. жывёлы (116.800 галоў) і авечак (21.707 галоў) занімала першае месца і другое па забою свіней (5038 галоў). Быўшая Менская губ. у тым жа годзе займала другое месца па забою б. раг. жывёлы (104.939 галоў) і авечак (8.509 галоў) і першая месца па забою свіней (21.333). Б. Магілёўская губ. займала апошняе месца.

З б. Менскай губ буйная раг. жывёла і свіні вывазіліся ў Варшаву (49 проц.), Ленінград (б. Петраград) і Маскву (51 проц). З б. Віцебскай і Магілёўскай губ. мяса вывазілася ў Маскву і Ленінград. У 1914 годзе ў Менск ужо ўвазілася мяса з б. Херсонскай губ., праўда у невялікай колькасці.

Вучота работы разніц у дарэвалюцыйны час, а таксама за час грамадзянскай вайны не захавалася, да яго амаль што і не было. Недастаткова ўдзелялася ўвага справе вучота работы і ў гады вастанавіцельнага перыяда і толькі з 1925—26 г. некаторыя разніцы (Менская, Гомельская, Віцебская) прыступілі да складання каштарысаў.

У 1918 годзе, пры нацыяналізацыі ўсёй народнай гаспадаркі ў РСФСР, Віцебская, Гомельская, Магілёўская і др. гарадскія разніцы былі перададзены гарадскім камунальным гаспадаркам. У 1920 г., пасля аслабанення Менска, Бабруйска, Слуцка і др. гарадоў ад белапалякаў, разніцы таксама былі перададзены гарадскім камунальным гаспадаркам. У часы НЭП'а (1925 г.) дробныя разніцы, часткова, здаваліся ў арэнду прыватным асобам, а з 1925 г. усе гэтыя прадпрыемствы здаваліся ў арэнду сельскім і др. кааперацыйным арганізацыям. У канцы 1929 г. разніцы буйных гарадоў: Менская, Гомельская, Магілёўская, Віцебская, Бабруйская і др. былі перададзены ў сістэму Саюзмяса.

Прыватна-капіталістычная пабудова ладу б. Расіі і бесплана-вае вядзенне ею гаспадаркі ўвадзілі беспарадак і ў разніцкай справе, што выклікала масавыя злоўжыванні ў выглядзе патаемнага забою жывёлы, ігнараванне мінімальных санітарных

Дадзеныя па Віцебскай, Менскай і Магілёўскай губ. узяты па ныне займаемай тэрыторыі Савецкай Беларусі.

умоў утрымання разніц, безнаглядная продажы мяса і інш. Пры такіх умовах правядзенне вучоту спажывання мяса насельніцтвам і правядзенне адпаведных ветэрынарна санітарных мераприемстваў на разніцах было немагчыма.

Па звесткам Веткіраўніцтва НКЗ БССР, у 1929 годзе ў Совецкай Беларусі ўжо налічвалось усяго 132 разніцы, што складала павялічэнне на 265 проц. у параўнавні з 1918 годам. Гэта значыць, што нагляд за убоем жывёлы і за месцамі забою яе з боку ветэрынарыі значна павялічыўся. Праўда, з гэтай колькасці разніц невялікая частка іх (Менская, Магілёўская, Віцебская, Гомельская і др.) былі належным чынам абсталяваны, а значная колькасць—дробныя разніцы (Петрыкоўская, Сененская, Чашніцкая, Суражская) амаль зусім не былі абсталяваны і ў большасці насілі характар забойных пляцовак. Хаця дробныя разніцы і недастаткова былі прыстасаваны для гэтай работы, але дасягненнем з'яўляецца ўжо тое, што за імі ўстаноўлен пастаянны ветерынарны нагляд, без якога забой жывёлы і вываз мяса з месц забоя не вытвараецца. Старыя разніцы, нават у буйных гарадах, былі пабудаваны з разлікам на абслугоўванне дробна капіталістычнай гаспадаркі. Яны не адпавядалі патрабаванням буйнай социялістычнай прамысловасці, чаму ў сучасны момант частка іх рэарганізавана (Менская, Гомельская, Віцебская, Магілёўская) у мясакамбінаты з дапабудовай да іх халадзільнікаў (2), каўбасных фабрык, кішэчных і ўцілізацыйных цэхаў, а такія разніцы, як Бабруйская, Полацкая і др.,— пашыраны за лік новых каўбасных, кішэчных і т. д.

Пастанова ЦК ВКП(б) ад 20/XII—1929 года караным чынам змяніла ва ўсім Саюзе існаваўшую сістэму разніцкай справы, яе будаўніцтва і яе архаічныя метады скарыстання скотсыр'я. Поўнае і рацыянальнае выкарыстанне забойнай жывёлы і выпрацоўка з яе адпаведных прадуктаў харчовага, тэхнічнага і спецыяльнага прызначэння можа ісці, і ідзе ў Совецкім Союзе, шляхам утварэння буйнай мясновай прамысловасці, пабудаванай на падставе навейшых дасягненняў перадавой тэхнікі, арганізаванай на социялістычны лад. Такім прадпрыемствам у БССР з'яўляецца Аршанскі мясакамбінат, пабудаваны ў 1929-30 годзе складаючыйся з 10 цэхаў. Прапускная здольнасць камбінату за змену больш 1000 галоў жывёлы. У сучасны момант на камбінаце працуе больш 400 чалавек, а ўсяго у мясной прамысловасці БССР налічваецца больш палутары тыс. чалавек.

Для развіцця мяса-апрацоўчай прамысловасці ў Совецкай Беларусі маюцца вялікія перспективы. К пачатку 1935 года было буйнай рагатай жывёлы 1491,9 тыс. галоў свіней—1480,4 тыс. галоў і авечак—752,5 тыс галоў. За апошнія гады лік жывелы ў значна павялічыўся Гэта гаворыць аб тым, што ў БССР для мяса-апрацоўчай прамысловасці сыр'евая база створана і ў будучым з яшчэ большай сілай і больш шпаркімі тэмпамі будзе пашырацца.

Работа мяса-апрацоўчых прадпрыемств БССР за некаторыя гады выразілася у наступным (гл. таб. № 2).

Табліца № 2

| Назва жывелы | Забіта жывёлы на мяса | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1913 г. | 1925/26 | 1928/29 | 1933 г. | 1934 г. |
| Буйн. раг. жывёлы | 5130 | 174510 | 278229 | 68972 | 41388 |
| Свіней | 41701 | 17010 | 66641 | 32622 | 23748 |
| Цялят | — | 93363 | 189481 | — | — |
| Авечак і коз | — | 26967 | 54888 | 71437 | 80211 |

Такім чынам бачна, што забой на мяса буйнай рагатай жывёлы у 1933 і 1934 г., у параўнанні з 1913 г., павялічыўся на 80—85 проц., а забой свіней складаў 71 проц. у 1933 г. і 57 проц. у 1934 годзе да забою 1913 года. Найбольшы забой свіней, у параўнанні з 1913 годам, быў у 1928/29 г. З года у год павялічваецца і грашовы зварот у мясной прамысловасці. У 1925/26 годзе разніцы ад забою жывёлы выручылі 656.164 р., у 1927/28 годзе—508 377 р. Мясная прамысловасць Совецкай Беларусі толькі па сістэме Белмяса мела звароты: у 1932 г.— 1.802.200 руб., у 1933 годзе—22 928.000 руб. і ў 1934 годзе— 20.365.000 руб. (у неізменых цэнах 1926/27 года). Змяншэнне звароту у 1934 годзе, у параўнанні з 1933 годам, з'яўляецца ў выніку таго, што частка скотасыр'я-жыўнасці накіравана на перапрацоўку на Ленінградскі мясакамбінат. У абсалютных лічбах удзел Совецкай Беларусі ў мясной прамысловасці усяго Совецкага Союза значна перавышае папярэднія гады.

У сучасны момант наша мясная прамысловасць выпускае шмат фабрыкатаў: мяса, больш 42 сартоў розных каўбас і капчонасцяй, 9 асартыментаў эндокрынага сыр'я, скурсыр'ё, да 10 асартыментаў кішэчных фабрыкатаў, шэраг фабрыкатаў галлевых і уцільцэхаў (кравяную і мясакосную муку, альбумін, фібрын, рага і капыты, волас і шчаціну, косць і інш.), больш 10 асартыментаў тапленага сала і др. Усяго выпускаецца каля 85 асартыментаў вырабаў, чаго быўшая разніцкая справа нават сябе і не уяўляла. Такім чынам створана мясная прамысловасць Совецкай Беларусі.

## II

Другую частку работы нашых мясакамбінатаў і разніц займае ветэрынарна-санітарнае абслугоўванне іх, ад чаго залежыць санітарнае становішча мясакамбінатаў, разніц і добрая якасць выпускаемай імі прадукцыі. Тэхналогічны працэс перапрацоўкі

жывелы на мясакамбінатах мае рад удасканаленняў і паляпшэнняў. Нашы мясакамбінаты маюць тэхнічна-адукаваных спецыялістаў тэхналогаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй. Кіруючы склад гэтых прадпрыемстваў паглыбляюць свае веды праз курсы. Рабочыя на працягу 4 х год прахадзілі курсы тэхмінімума, а зараз праходзяць тэхмаксімум. Шырако разгорнуты стаханаўскі рух і праводзіцца напружаная работа калектываў рабочых за аўладанне тэхнікай у мясной прамысловасці. Ветэрынарныя работнікі на мясакамбінатах у справе прапаганды ведаў аўладання тэхнікай ветэрынарна-санітарнай граматнасці павінны адыграць значную ролю. Але некаторыя з іх яшчэ недастаткова ўліліся у рабочую сраду гэтых прадпрыемств; часам вядуць сябе зусім ізаліравана (на Віцебскім, Гомельскім, Магілеўскім мясакамбінатах) ад агульнай масы рабочых, не карыстаюцца аўтарытэтам як «урач», а адгэтуль і эфектыўнасць іх работы невысокая. У некаторых таварышоў не адчуваецца адказнасці ў пастаўленай перад імі задачы. Недастаткова ўдзеляецца ўвага некаторымі па падвышэнню сваіх спецыяльных ведаў

Аб тым, наскольки ветэрынарна-санітарная работа на мясакамбінатах і разніцах з'яўляецца адказнейшым вучасткам, гавораць лічбы, за рад гадоў, выяўленых хвароб на ўбойнай жывеле (гл. табл. 3).

Лічбы, прыведзеныя ў табліцы № 3 адлюстроўваюць выяўленне некаторых хвароб на мясакамбінатах пасля забою жывёлы на мяса. У сярэднім за 5 гадоў гэтыя лічбы характэрызуюцца наступным: у буйнай рагатай жывёлы акцінамікоз—0,014 процантаў,туберкулез—0,75 проц., эхінакокоз—1,71 проц., фасціолез—10,9 проц., і фіноз—0,01 проц.; у свіней туберкулез —0,106 проц., фасціолез—0,21 проц., эхінакокоз—5.51 проц., трыхінеллез—0,8 проц. і фіноз 5,17 проц.; у авечак і коз фасціолез—15,84 проц. і эхінакокоз—5,87 проц.

Не гледзячы на тое, што у сярэднім за 5 годоў процант выяўлення адзначаных хвароб і высокі, але-ж яскрава кідаецца у вочы зніжэнне гэтых хвароб за апошнія гады, як туберкулез, эхінакокоз і фасціолез у буйн. раг. жывелы, чума і паразітарныя хваробы у свіней, эхінакокоз і фасціолез у авечак. Гэта кажа аб культурным росце соўгасаў і калгасаў і аб культурным утрыманні імі жывелы. Маючыяся некаторыя неувязкі лічбаў 1926-27 г. (у параўнанні з паследуючымі гадамі) па трыхінелезу з'яўляецца вынікам таго, што у 1926 годзе (і раней) не усюды праводзілася трыхінелескапія мяса свініны, а таму 0,3 проц. для таго часу не зусім сапраўдныя; за апошнія гады трыхінелез па даным нашым мясакамбінатаў заметна ўмяншаецца. Прыведзеныя лічбы аб наяўнасці некаторых хвароб у забойнай жывелы гавораць аб тым, што значная частка мяса павінна быць недапушчана да карыстання у ежу, як хворае. Па прыблізным падлікам знішчэнне такога мяса наогул дасягае да 160 тон у

Табліца № 3

| За які год | Назва забойнай жывёлы | Колькі забіта жывёлы | Выяўлена хвароб на забойн. жыв. у проц. | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Акцынамікоз | Туберкулёз | Чума свіней | Эхінококкоз | Фасцыолёз | Трыхінелез | Фіноз |
| 1926-27 | Б. раг. жывёла . . . | 180678 | — | 1,7 | — | 1,8 | 15,4 | — | 0,01 |
| | Свінні . . . . . . | 60170 | — | 0,26 | — | 8,07 | 1,28 | 0,3 | 5,94 |
| | Авечкі і козы . . . | 30490 | — | — | — | 25,6 | 31,5 | — | — |
| 1928-29 | Б. раг. жывёла . . . | 278229 | — | 0,8 | — | 2,4 | 13,0 | — | 0,016 |
| | Свінні . . . . . . | 66641 | — | 0,09 | — | 6,7 | 0,3 | 1,2 | 7,7 |
| | Авечкі і козы . . | 54888 | — | — | — | 1,1 | 20,6 | — | — |
| 1931 | Б. раг. жывёла . . | 214434 | 0,03 | 0,14 | — | 3,3 | 5,0 | — | — |
| | Свінні . . . . . . | 86180 | — | 0,03 | 11,7 | 4,6 | — | 1,02 | 5,1 |
| | Авечкі і козы . . . | 185123 | — | — | — | 0,8 | 8,5 | — | — |
| 1933 | Б. раг. жывёла . . . | 69350 | 0,01 | 0,8 | — | 0,8 | 11,2 | — | — |
| | Свінні . . . . . . | 32725 | — | 0,03 | 2,2 | 3,9 | — | 0,8 | 3,7 |
| | Авечкі і козы . . . | 171976 | — | — | — | 1,07 | 10,7 | — | — |
| 1934 | Б. раг. жывёла . . | 41388 | 0,03 | 0,29 | — | 0,26 | 10,4 | — | 0,029 |
| | Свінні . . . . . . | 23748 | — | 0,12 | 1,9 | 4,3 | 0,5 | 0,7 | 3,4 |
| | Авечкі і козы . . . | 80211 | — | — | — | 0,8 | 7,9 | — | — |

год—на суму да 500 тыс. рублеў. Гэтыя данныя ускладаюць асаблівую адказнасць на ветэрынарных работнікаў, у якой бы сістэме яны не работалі,—у сэнсе выхавання здаровага скотасыр'я для нашай мясной прамысловасці.

Развіцце жывелагадоўлі у нашых гаспадарках патрабуе дакладнага вучоту месц недабрабытных па хваробам жывел. Але хваробы, каторыя працякаюць зацяжна (туберкулез, акцінамікоз, фасціолез і эхінакоккоз, фіноз і трыхінелез і др.), мала прыкметны пры жыцці, пазнаюцца толькі пасля забою жывелы. Мясакамбінаты і разніцы павінны з'яўляцца фільтрам аздараўлення соцыялістычнай жывелагадоўлі. Поўная і належным чынам апрацаваная рэгістрацыя хвароб той, ці іншай партыі забойнай жывелы і сваечасовае паведамленне аб іх гаспадарак, адкуль дастаўлена скотасыр'е, павінна з'яўляцца адпраўным матэрыялам у арганізацыі мерапрыемств па аздараўленню жывелы даннай гаспадаркі. Гэта частка работы у справе жывелагадоўлі ляжыць на ветэрынарных работніках мясакамбінату і разніц.

Вялікім дасягненнем нашых мясакамбінатаў з'яўляюцца хіміка-бактэрыялагічныя лабараторыі, якія кантралююць амаль усе вырабы, выпускаемыя мясакамбінатам. На разніцах такіх

лабараторый не было, а калі дзе-небудзь і былі (Віцебск, Менск), то яны насілі любіцельскі характар і не пахожы былі на лабараторыі. Хіміка-бактэрыялагічныя лабараторыі з'яўляюцца люстрам нашых мясакамбінатаў; яны павінны, у сапраўднасці так і есць, - забяспечыць совецкага спажыўца высокаякаснымі і здаровымі харчовымі прадуктамі, як мяса, каўбасы, шынка, тапленае сала і др.

Не гледзячы на некаторые недахопы, паказаныя у II - частцы гэтага артыкула, мясная прамысловасць Совецкай Беларусі (якой раней амаль не было) вырасла у магутную гаспадарчую адзінку, як і другія галіны нашай соцыялістычнай прамысловасці. Такіх велізарных поспехаў у мясной прамысловасці за кароткі час Совецкая Беларусь змагла дабіцца толькі на фоне уздыму усей народнай гаспадаркі Совецкага Союза, на чале якога стаяць неперможныя - комуністычная партыя і рабоча-сялянскі ўрад.

---

## Літаратура


1. Беларускі архіў. Менск. т. II, 1928 г. ст. 246—247.
2. Гістар. юрыд. мат. з актавых кніг губ. Віцебскай і Магілеўскай. 1877 г. ст. 370.
3. Акты Віленскай Археаграф. камісіі 1872 ст. 453.
4. Сапунов—Віцебская старына 1886 г. ст. 172—179.
5. Гістар. юрыдыч. матарыялы з кніг Віцебскай і Магілеўскай губ., т. XII 1881 г.
6. A. Moreau—Современныя скотобойни. 1911 г.
7. Отчеты Вет. Упр. М. Внут. дел за 1910, 1911, 1912, 1913, 1914, 1915 г.
8. Антоневич—Бойни с санитарной точки зрения 1899 г.
9. Мари—Руководство к осмотру мяса 1911 г.
10. Сельское хозяйство СССР 1935 г. изд. 1936 г.
11. Корнюшин—Соврем. мясн. индустр. 1932 г.
12. Корнюшин—Пути советской мясной индустрии. 1931 г.
13. Половинкин—Мясное и боенское дело. 1931 г.
14. Беконский—Технология мяса. 1926 г.
15. Михайлов А. И.—Основы экономики социалистической мясной индустрии (курс лекц.). 1935 г.
16. Горегляд Х. С.—Белоруская ветер. № 6-7, 1927 г.
17. R. Ostertag—Handbuch der Fleischbeschau. B. I 1922.